# ПРАФЕСАР МАГІЛЁЎ – ЗАСНАВАЛЬНІК КАФЕДРЫ АКУШЭРСТВА І ГІНЕКАЛОГІІ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МЕДЫЦЫНСКАГА ІНСТЫТУТА

**Плоцкі А. Р.**

*УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўнверсітэт», г. Гродна, Беларусь*

Інфармацыя, што тычыцца прафесара М. В. Магілёва – першага загадчыка кафедры акушэрства і гінекалогіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута – надзвычай нешматлікая. У розных выданнях, практычна заўсёды прысвечаных рознага кшталту юбілейным падзеям у жыцці кафедры альбо ўніверсітетэта, звычайна ўзгадваюцца станоўчыя якасці прафесара з традыцыйным пералікам яго працоўных месцаў, колькасці публікацый і падрыхтаваных паслядоўнікаў. Старанна перапісваецца з артыкула ў артыкул інфармацыя аб «широко эрудированном профессоре довоенной школы, обладающем высокой культурой, прекрасном специалисте и педагоге, исключительно виртуозном хирурге». Насамрэч жыццё прафесара Магілёва было насычаным і наўрад ці вельмі простым, і нават хуткі прагляд яго афіцыйнай біяграфіі дазваляе ўпэўніцца ў гэтым.

Міхал Веніямінавіч Магілёў нарадзіўся ў Кіеўскай губерніі ў мястэчку Звянігародка (ў цяперашні час – Чэркасская вобласць) 1 чэрвеня 1898 г. Будучы прафесар з’явіўся на свет у сям’і служачых – як паведамлена ім самім у аўтабіяграфіі, бацька быў урачом, маці – настаўніцай. Іншых звестак пра сям’ю прафесара Магілёва папросту няма. У 1918 г. Міхал Веніямінавіч распачаў навучанне ў Кіеўскім медыцынскім інстытуце, а пасля паспяховага яго заканчэння працаваў у мястэчку Манастырышча ў якасці павятовага лекара. У 1925 г. ён атрымаў магчымасць займацца на курсах па акушэрству і гінекалогіі ў Дзяржаўным інстытуце ўдасканалення ўрачэй імя С. М. Кірава ў Ленінградзе, дзе і застаўся працаваць на пасадах навуковага супрацоўніка, а пазней – асістэнта і дацэнта. У 1937 г. М. В. Магілёў атрымаў званне прыват-дацэнта пасля публічнай лекцыі «Кансерватыўная хірургія ў гінекалогіі».

Працу выкладчыка і клініцыста Міхал Веніямінавіч заўсёды спалучаў з дзейнасцю навуковай, адначасова з’яўляючыся супрацоўнікам Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай медыцыны імя М. Горкага. Ён працаваў пад кіраўніцтвам прафесара Я. С. Лондана, вынікам чаго з’явілася паспяховая абарона дысертацыі «Аварыяльны інкрэт і яго ўзаемаадносіны з ганадатропнымі гармонамі цяжарных – праланам А і В», што мела месца ў 1938 г. У наступным годзе М. В. Магілёў атрымаў навуковую ступень доктара медыцынскіх навук, а ў ліпені 1941 г. – званне прафесара. Зразумела, што дыплом прафесара М. В. Магілёў здолеў атрымаць толькі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

З 1940 па 1945 г. прафесар Магілёў працаваў на пасадзе загадчыка кафедры акушэрства і гінекалогіі Сярэднеазіяцкага (ў цяперашні час –



Рэпазіторый ГрДМУ

Ташкентскага) інстытута ўдасканалення ўрачэй. Ужо ў той няпросты час яго характарызавалі як таленавітага выкладчыка, дасведчанага клініцыста, высокаадукаванага хірурга з вялікай схільнасцю да наватарскіх падыходаў лячэння захворванняў органаў жаночай палавой сферы. Прафесар М. В. Магілёў быў старшынёй Ташкентскага навуковага таварыства акушэраў-гінеколагаў, а таксама працаваў кансультантам у паліклініках і эвакуацыйных гаспіталях Ташкента.

З 1945 г. прафесара Магілёва накіравалі ў Кішынёўскі дзяржаўны медыцынскі інстытут дзеля стварэння кафедры акушэрства і гінекалогіі. У якасці загадчыка ён быў вымушаны самастойна распрацаваць тэматыкі заняткаў і арганізаваць эфектыўную клінічную дзейнасць. Кафедра займала ў шпіталі толькі адзін пакой – уласна кабінет прафесара. У гэтым пакоі і праводзіліся заняткі. У радзільным аддзяленні на 25 ложкаў не было ўласнай аперацыйнай, і пры неабходнасці выканання акушэрскіх аперацый лекары былі вымушаны ледзь не на руках пераносіць парадзіх у суседні корпус шпіталя. Практычна адсутнасць прыстойнай матэрыяльнай базы ў пасляваенны час не перашкодзіла прадэманстраваць прафесару Магілёву высокі ўзровень клініцыста і выкладчыка. Ён ніколі не нерваваўся, нават выконваючы самыя складаныя аперацыі, пазбягаў непатрэбных крыкаў і дэманстратыўнасці. Здавалася, што толькі сам факт прысутнасці прафесара садзейнічаў паспяховаму навучанню студэнтаў і супрацоўнікаў шпіталя. Акрамя тэхнікі аперацый, прафесар пільную ўвагу звяртаў на неабходнасць якаснай анэстэзіі і адэкватнага маніторынгу ў пасляаперацыйным перыядзе.

З нагоды частых абвастрэнняў трапічнай малярыі прафесар Магілёў быў вызвалены ад працы ў Малдове, два гады загадваў курсам акушэрства і гінекалогіі стаматалагічнага інстытута ў Ленінградзе, а з 1951 г. ачольваў кафедру акушэрства і гінекалогіі Сталінскага (Новакузнецкага) інстытута ўдасканалення ўрачэй. Сказаць, што гэта быў няпросты перыяд працы – напэўна, не сказаць нічога. Па-першае, гэта была велізарная адказнасць – інстытут быў вельмі буйной установай (трэцяй па рангу пасля Ленінградскага і Казанскага інстытутаў), па-другое – гэта быў палітычна няўстойлівы перыяд у краіне, калі дастаткова ўзгадаць толькі сумна вядомае «дело врачей». Нарэшце, па-трэцяе – раней інстытут лакалізаваўся ў Новасібірску, аднак з былых супрацоўнікаў у Новакузнецк прыехала менш за чвэрць. І зноў ва ўмовах першапачатковай адсутнасці матэрыяльнай базы прафесар М. В. Магілёў паспяхова аднавіў усе неабходныя напрамкі дзейнасці кафедры з дапамогай свах калег (дацэнт Р. І. Маўшовіч, асістэнты Н. М. Гетман-Сычова, В. Н. Гранат).

З 1955 г. да моманту распачатку працы ў Гародні прафесар Магілёў паспяхова здолеў арганізаваць працу яшчэ адной профільнай кафедры Благавешчанскага медыцынскага інстытута (цяпер – Амурская дзяржаўная медыцынская акадэмія). Больш таго, прафесар лічыцца стваральнікам клінічнай акушэрска-гінекалагічнай службы Амурскага рэгіёна. Пры яго непасрэдным удзеле была створана навуковая лабараторыя па даследванні функцыі нырак у



Репозиторий ГрГМУ

цяжарных з гіпертэнзіўнымі парушэннямі, вывучаліся асаблівасці цяжарнасці пры гіпатаніі, таксама высвятляліся магчымасці электрафонаграфіі дзеля ацэнкі стану плада.

З 25 жніўня 1961 г. прафесар М. В. Магілёў узначаліў кафедру акушэрства і гінекалогіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Ён рацыянальна карыстаўся велізарным досведам, атрыманым падчас працы ў розных рэгіёнах краіны. Прафесар без цяжкасцяў знаходзіў узаемаразуменне з кіруючымі асобамі Міністэрства аховы здароўя па пытаннях арганізацыі дзейнасці кафедры, неаднаразова выпраўляўся ў Ленінград дзеля асабістага ўдзелу і атрымання вучэбных матэр'ялаў для паляпшэння заняткаў студэнтаў. Яго кансультацыі ў Гродзенскім і Брэсцкім рэгіёнах былі запатрабаваныя між калег. Аднак былі і канфліктныя сітуацыі, што, прыкладам, адлюстравана ў сценаграме паседжання Гродзенскага таварыства акушэраў-гінеколагаў у 1963 г., на якім даволі палка абмяркоўвалі пытанні ўзаемадзеяння супрацоўнікаў кафедры і працаўнікоў радзільнага стацыянара. Высвятляецца, што цяперашнія, так бы мовіць, «непаразуменні» не такія ўжо і арыгінальныя па сутнасці сваёй: узгадваюцца пытанні размеркавання аперацый, праца ў начны час, нават асабістыя адносіны. Прадстаўнікі кіраўніцтва радзільнага дома скардзіліся на паблажлівае, нават высакамернае стаўленне да іх супрацоўнікаў кафедры на чале з прафесарам, адзначаліся нават некарэктныя адносіны да калег з боку Міхала Веніямінавіча. Хоць медыцынскія работнікі, што працавалі разам з прафесарам, наадварот адзначалі яго сціпласць, ветлівасць, і гэта ён, дарэчы, імкнуўся бачыць у іншых.

Колькі словаў аб навуковых працах М. В. Магілёва – яны тычыліся розных аспектаў фізіялогіі жаночага арганізма, сілкавання пры цяжарнасці, тэхнікі аперацый, што былі апублікаваныя ў вядучым часопісе «Акушерство и гинекология». Ужо ў Гародні прафесар атрымаў кнігі, выдадзеныя ў Благавешчанску і Кішынёве: «Гігіена жанчыны» і «Неадкладныя мерапрыемствы пры атанічным крывацёке ў паследавам і пасляродавым перыядзе (дапаможнік сельскага акушэра)», у якім, дарэчы, ён прапанаваў арыгінальныя методзікі аказання дапамогі.

Прафесар М. В. Магілёў цяжка хварэў – злаякасная пухліна страваводу. З-за гэтага ён і пайшоў з жыцця 14 сакавіка 1967 г., пахаваны ў Гародні на старых могілках. За ўвесь час сваёй няпростай працы Міхал Веніямінавіч Магілёў атрымаў Ганаровую грамату Прэзідыюма Вярхоўнага Савета Узбекскай ССР, медаль «За доблестный труд» і ўдзячнасць Міністра аховы здароўя Беларускай ССР.

Рэпазіторый ГрДМУ